# Прамень адзінства і любові




**Удзельнікі экспедыцыі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**У шаснаццаты раз праходзіць Рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя з нязгаснай лампадай, прымеркаваная да Дня беларускага пісьменства. За ўсе гады ў праекце паўдзельнічала каля 200 чалавек: пісьменнікаў, навукоўцаў, журналістаў, святароў, настаўнікаў, медыкаў, артыстаў — людзей, неабыякавых да духоўнай культуры Беларусі.**

Кожны год экспедыцыя пашырае сваю геаграфію, але застаецца традыцыйным першае месца, якое наведваюць удзельнікі праекта: гэта Святое поле пад Баранавічамі, непасрэдна звязанае з ваеннымі старонкамі гісторыі нашага краю. Апрача яго, сёлета маршрут праекта пралягае паўз вёскі і гарадскія пасёлкі паміж Салігорскам, Мазыром, Лельчыцамі, Смалявічамі, Чэрвенем і складае, па словах намесніка кіраўніка экспедыцыі, супрацоўніка Інстытута мовы і літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа НАН Беларусі Аляксандра Лапаты-Загорскага, 1200 кіламетраў. А завершацца духоўна-асветніцкія мерапрыемствы ў Смаргонскім раёне.

Цікавая адметнасць сёлетняга праекта ў тым, што папярэдне са Смаргоні было ўзята трошкі зямлі, частка якой цягам экспедыцыі будзе "абменьвацца" ў прамежкавых прыпынках. У канцы экспедыцыі зямля з розных месцаў "паяднаецца", што падкрэсліць дэвіз праекта: "Адзінствам і любоўю ўратуемся!".

**К.А.**